Да 100-годдзя з пачатку Першай сусветнай вайны

# МАЎКЛІВЫЯ АХВЯРЫ ЖОРСТКІХ БАЁЎ: ПАЛАЦА-ПАРКАВЫЯ АНСАМБЛІ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

У дапамогу арганізатарам краязнаўчай работы



**А. І. Смолік,**
загадчык кафедры культуралогіі
Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтва,
доктар культуралогіі, прафесар

**Вялікая, або Першая сусветная вайна (1914–1918 гг.), 100 год з пачатку якой споўнілася ў жніўні, выклікала маштабныя сацыяльна-палітычныя змены ва ўсім свеце. У глабальнае супрацьстаянне былі ўцягнуты буйнейшыя краіны: Англія, Аўстра-Венгрыя, Аўстралія, ЗША, Італія, Расія, Сербія, Францыя, Турцыя, Японія. Усяго – 33 дзяржавы і іх калоніі. Падлічана, што на франтах Першай сусветнай вайны загінула каля 10 млн чал., 20 млн атрымалі раненні, 10 млн памерлі ад голаду і хвароб [6, с. 475].**

**Тры гады ваенныя дзеянні адбываліся непасрэдна на тэрыторыі Беларусі. Наша краіна была падзелена на дзве зоны: усходнюю, якая стала месцам дыслакацыі расійскай арміі, і заходнюю, акупаваную войскамі кайзераўскай Германіі і яе саюзнікамі. Значная частка беларускіх мужчын была мабілізавана ў расійскае войска, 70 тыс. з іх загінулі ў баях. Яшчэ 60 тыс. мірных жыхароў беларускіх гарадоў і вёсак былі знішчаны ў выніку бамбёжак, артылерыйскіх абстрэлаў і карных дзеянняў акупантаў. 50 тыс. беларусаў акупанты прымусова вывезлі ў Германію і Аўстра-Венгрыю, больш за 2 млн чалавек вымушаны былі стаць бежанцамі.**

**Аднак трагедыя Першай сусветнай вайны – гэта не толькі тысячы і тысячы зламаных людскіх лёсаў, але і сотні назаўсёды страчаных гістарычных і культурных каштоўнасцей. У полымі вайны гарэлі бясцэнныя кніжныя зборы, мастацкія калекцыі, руйнаваліся храмы і палацы. Сёння мы раскажам толькі аб трох з іх, так што можаце ўявіць сабе маштабы бедстваў, якія прынесла нашай краіне Першая сусветная вайна.**

## Паўночныя Афіны

Залескі палаца-паркавы комплекс (размешчаны ў Смаргонскім раёне), ці «Паўночныя Афіны», адносіўся да шэдэўраў сусветнага дойлідства. Помнік палаца-паркавай архітэктуры XVIII–XIX стст. належаў роду князёў Агінскіх гербу «Ляліва». З 1802 г. уладальнікам маёнтка стаў праслаўлены кампазітар, вядомы дыпламат і грамадскі дзеяч Міхал Клеафас Агінскі, які пераўтварыў Залессе ў сваю рэзідэнцыю [1, с. 218]. (Дарэчы, наступны, 2015 год ЮНЕСКА аб'явіла годам М. К. Агінскага з нагоды яго 250-гадовага юбілею і ў знак вялікага ўнёску ў сусветную культуру і асвету.)



Палаца-паркавы комплекс складаўся з дзвюх частак – старой сядзібы, пабудаванай у першай палове XVIII ст. у стылі барока (на жаль, да нашага часу яна зусім не захавалася), і новага ансамбля, узведзенага ў 1802–1805 гг. у

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

стылі класіцызму. Віленскі губернскі архітэктар І. Пусэ і прафесар архітэктуры пры Віленскім універсітэце М. Шульц выбралі для стварэння ансамбля свабодную тэрыторыю паміж Бабрынкай і Рудзіцай, дзвюма рэчкамі, якія агіналі тэрыторыю рэзідэнцыі і неслі свае воды ў Вілію. Палац уяўляў сабой двухпавярховы мураваны Г-падобны будынак. Галоўны прамавугольны корпус палаца меў сіметрычна-восевую кампазіцыю з двухпавярховымі бакавымі павільёнамі і цэнтральнай мансардавай часткай, вылучанай чатырохкалонным дарычным порцікам і вежкай з гадзіннікам. Заходняе крыло галоўнага фасада завяршалася двухпавярховым павільёнам.

Палац пабудавалі за чатыры гады, але фарміраванне архітэктурнага ансамбля, стварэнне батанічнага саду доўжыліся яшчэ амаль два дзесяцігоддзі. Граф-краязнаўца К. Тышкевіч, які ў 1857 г. падчас чатырохмесячнай фальклорна-этнаграфічнай экспедыцыі па рацэ Віліі наведаў сядзібу Агінскіх, адзначаў, што ў садзе «расліны найрадчэйшыя, прывезеныя з Вільні прыродазнаўцамі Юндзілам і Струмілам, не горшыя, чым у Шчорсаўскім батанічным садзе Храптовіча» [10, с. 82]. На тэрыторыі рэзідэнцыі Агінскіх таксама знаходзіліся дзве аранжарэі. Фасад першай быў аздоблены паўкалонамі і высокімі арачнымі вокнамі. Другая аранжарэя размяшчалася перпендыкулярна першай і мела над адным з фасадаў суцэльныя нахіленыя вокны.

Побач з палацам была ўзведзена васьміграная капліца з шатровым дахам і выдатнымі фрэскамі ўнутры. Адным з элементаў ансамбля з'яўляўся шпацырны звярынец з дарожкамі, абсаджанымі дрэвамі і шматлікімі кветкамі. На тэрыторыі звярынца былі дзве мураваныя альтанкі – паўкруглая з чатырохкалонным порцікам, высокімі шклянымі дзвярыма і авальнымі вокнамі і круглая двухпавярховая з драўляным бельведэрам і завяршэннем у выглядзе трох кветак, «кітайская». Яшчэ адзін звярынец, з дзікімі жывёламі, абнесены магутнай драўлянай агароджай, быў размешчаны за ракой Бабрынкай.

Рэзідэнцыю акаляў пейзажны парк у рамантычным стылі. Закладваў яго знакаміты садоўнік Я. Пеўзнер на беразе ракі Бабрынкі побач са шпацырным звярынцам. Парк з'яўляўся эстэтычным аналагам навакольнага прыроднага ландшафту. Паляны ў ім упрыгожваліся «партэрамі» кветак і кветкавымі клумбамі. Ад палаца з пэўных месцаў парку адкрываліся цудоўныя краявіды: навакольныя лес, пойма ракі, возера ўражвалі сваёй натуральнай прыгажосцю.

Паркавыя кампазіцыі ў значнай ступені вызначаліся тапаграфіяй і геамарфалагічнымі ўмовамі мясцовасці. Так, у паніжанай паўночна-заходняй частцы меўся вялікі (2 га) вадаём з астравамі. На тэрасах паўночна-ўсходняй часткі парка былі сфарміраваны пейзажныя насаджэнні ў асноўным з ліпы і вяза. Парк перасякаўся цэнтральнай алеяй, яго асноўным структурна-кампазіцыйным элементам. Акцэнтам перспектывы з'яўляўся заходні востраў з перакідным мастком. У парку была пабудавана вежа са шпілем, некалькі рамантычных альтанак, якія называліся «святынямі», устаноўлены памятныя камяні ў гонар Тадэвуша Касцюшкі. Лічаць, што надпіс «Ценям Касцюшкі» на валуне высек сам Міхал Клеафас Агінскі.




*Залессе. Памесце Агінскіх. 1802-1822 гг.*

Сучаснікі графа сцвярджалі, што «Паўночныя Афіны» ўяўлялі сабой «архітэктурна-паркавую дасканаласць» і «дзівосную прыгажосць». Нездарма тут заўсёды было шмат знакамітых гасцей. Канстанцін Тышкевіч пісаў, што ў розныя гады ў Залессі працяглы час гасцявалі дырэктар імператарскіх тэатраў В. Казлоўскі, вядомы іспанскі музыкант Р. Эскудэра, італьянскі кампазітар Д. Паліяні, беларускі паэт А. Ходзька. Часта туды прыязджалі прафесары Віленскага ўніверсітэта. Прыгажосць палаца-паркавага ансамбля і асаблівая творчая атмасфера «Паўночных Афін» натхніла А. Ходзьку на стварэнне цудоўнай паэмы, прысвечанай Залессю. У палацы адбываліся музычна-літаратурныя вечары з удзелам айчынных і замежных выканаўцаў [10, с. 83]. Менавіта тут князь Міхал Клеафас Агінскі напісаў свой знакаміты паланэз ля-мінор, вядомы пад назвай «Развітанне з Радзімай».

У 1822 г. М. К. Агінскі ад'язджае ў Італію і больш ніколі не вернецца ў дарагія яго сэрцу мясціны. Яго нашчадкі не здолелі належным

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

чынам падтрымліваць велічную прыгажосць ансамбля. Палаца-паркавы комплекс паступова прыходзіць у заняпад. Але самы непапраўны ўрон нанесла Залессю Першая сусветная вайна.

Восенню 1915 г. Смаргонскі павет апынуўся ў эпіцэнтры бесперапынных жорсткіх баёў рускай і германскай армій. Доўжыліся баі каля месяца, а 9 верасня германскія войскі перайшлі ў наступленне. З Усходняй Прусіі і Літвы яны рушылі ў напрамку мястэчка Свянцяны. За тыдзень немцам удалося пацясніць войскі 5-й і 10-й армій, захапіць Вілейку і выйсці ў раён Смаргоні, падысці да Маладзечна і Смалявіч. Гэтая аперацыя ўвайшла ў ваенную гісторыю як «Свянцянскі прарыў» (германскія войскі прарвалі рускі фронт і значна паглыбіліся ў тыл). У выніку гэтага прарыву расійскія арміі вымушаны былі адступіць амаль на сотню кіламетраў на ўсход. Праўда, звышчалавечымі намаганнямі расійскіх салдат на пачатку кастрычніка прарыў быў ліквідаваны і фронт стабілізаваўся па лініі Дзвінск – возера Нарач – Смаргонь – Баранавічы – Пінск.



У сакавіку 1916 г. пачалася так званая Нарачанская аперацыя, якая сваім чорным крылом зноў накрыла Смаргоншчыну. Тут самыя цяжкія кровапралітныя баі давялося весці групе расійскіх войск пад камандаваннем генерала П. С. Балуева. На фронце, у раёне Смаргоні, баі доўжыліся амаль два месяцы. 810 дзён расійская армія стрымлівала націск войск кайзераўскай Германіі, якія імкнуліся захапіць як мага большую частку тэрыторыі Беларусі. (Дарэчы, у абароне Смаргоні ўдзельнічалі будучыя знакамітыя пісьменнікі М. Зошчанка і В. Катаеў.)

Генштаб Галоўнай стаўкі ў Магілёве не здолеў якасна падрыхтаваць аперацыю: няўдала быў выбраны час наступлення – у разгар вясновай паводкі. Мясцовасць ператварылася ў суцэльныя балоты і азёры, што перашкаджала руху войска і артылерыі. У дадатак немцы нечакана выкарысталі снарады з удушлівым газам, ад якога ў расійскіх салдат не было сродкаў аховы. На гэтым участку фронту кіраўніцтва германскай арміі таксама апрабавала новую зброю – агнямёты. Расійскія афіцэры і салдаты сутыкнуліся з імі ўпершыню і таму панеслі вялікія страты.

У выніку вышэйназваных ваенных аперацый вельмі пацярпелі населеныя пункты Смаргоншчыны, у тым ліку і Залессе. Маёнтак быў пераабсталяваны ў шпіталь 10-й расійскай арміі, яго інтэр'еры – значна пашкоджаны. Унікальныя дрэвы парку выкарыстоўваліся на паліва і як матэрыял для будаўніцтва зямлянак, умацаванняў траншэй і акопаў. Адсутнасць належнага догляду за палацам, капліцай, альтанкамі, вадаёмамі і паркам не магла не адбіцца на знешнім і ўнутраным выглядзе ансамбля.

Яшчэ большыя страты палаца-парнаваму комплексу нанеслі белапольскія акупанты ў 1919–1920 гг. У той час была беззваротна зруйнавана трэцяя частка сядзібы. Разбурэнне працягвалася і ў савецкі перыяд. У 1939 г. маёмасць палаца-паркавага комплексу была нацыяналізавана, а па сутнасці разрабавана. Будынкі прыстасавалі пад калгасную стайню і трактарны стан. У былым палацы некалькі дзесяцігоддзяў мясціўся дом для састарэлых.

Такім сумным быў лёс некалі славутых сваёй прыгажосцю «Паўночных Афін». Мастацтвазнаўцы лічаць, што Залескі палаца-паркавы комплекс па духоўна-гістарычнай значнасці адэкватны Яснай Паляне Л. М. Талстога, Міхайлаўскаму А. С. Пушкіна, Карабісе А. М. Някрасава. У 1990-х гг. пачаліся работы па адраджэнні былой рэзідэнцыі славутага кампазітара. Сёння ўжо адбудавана каплічка, на старым падмурку ўзведзены вадзяны млын, адноўлена адна аранжарэя, вядзецца рэстаўрацыя палаца. Адпаведна праекту рэстаўрацыі, распрацаванаму мінскім унітарным прадпрыемствам «Праектрэстаўрацыя», мяркуецца, што на першым паверсе будзе адноўлены інтэр'ер XIX ст. і размесціцца экспазіцыя музея. Пад музейную экспазіцыю адвядуць таксама і крыло, дзе ў часы М. Агінскага была аранжарэя. У палацы з'явіцца музычна-тэатральная зала. Палаца-паркавы ансамбль у Залессі ўключаны ў Дзяржаўную праграму рэстаўрацыі архітэктурных помнікаў Беларусі. Будзем спадзявацца, што да юбілею М. Агінскага значная частка рэстаўрацыйных работ будзе завершана.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

## Мекка гісторыкаў і бібліяфілаў

Ваеннае ліхалецце 1914–1918 гг. не абмінула помнік архітэктуры і садова-паркавага мастацтва маёнтак Шчорсы ў Навагрудскім раёне. З сярэдзіны XV ст. ён належыў магнацкаму роду Храптовічаў герба «Адравонж» [1, с. 491]. Палаца-паркавы комплекс, у якім спалучаліся рысы барока і класіцызму, фарміраваўся на працягу XVIII–XIX стст. Асаблівую ролю ў яго стварэнні адыграў канцлер ВКЛ Іахім Ігнацій Юзаф Храптовіч. Пры ім у канцы XVIII ст. было завершана ўзвядзенне палаца-паркавага комплексу, куды ўваходзілі палац, павільён бібліятэкі, два флігелі, парк, службовыя і гаспадарчыя пабудовы. У цэнтры в. Шчорсы ў 1776 г. была ўзведзена Дзмітрыеўская ўніяцкая царква. Цэнтрам кампазіцыі ансамбля з'яўляўся мураваны П-падобны палац з парадным дваром.



Праектавалі палац архітэктары Дж. Сака і К. Спампані, яго ўзвядзеннем кіраваў вядомы архітэктар Якуб Габрыэль. У афармленні інтэр'ераў удзельнічалі знакамітыя тагачасныя мастакі І. Манькоўскі і А. Смуглевіч. Палац уяўляў сабой адна-двухпавярховы будынак з мансардавай часткай і купальным завяршэннем у цэнтры. Галоўны фасад быў аздоблены чатырохпілястравым порцікам з трохкутным франтонам. Будынак меў вытанчанае дэкаратыўнае афармленне. Другі паверх палаца ўпрыгожвалі арачныя вокны. Урачыстасць будынку надавала анфіладная з квадратным вестыбюлем і круглай залай у цэнтры планіроўка. Некалькі больш спрошчаная архітэктурная трактоўка была ў пабудаваных пазней аднапавярховых крылаў палаца. Яны рытмічна расчляняліся на франтальных фасадах прамавугольнымі вокнамі і пілястрамі ў прасценках. У пачатку XIX ст. да палаца былі прыбудаваны два сіметрычна размешчаныя аднапавярховыя флігелі, у якіх знаходзіліся службовыя памяшканні і стайня.

Іахім Храптовіч быў вялікім прыхільнікам кніжнай культуры і сабраў багатую бібліятэку. Даследчыкі лічаць, што ў яго рэзідэнцыі ў Шчорсах налічвалася больш за 15 тыс. тамоў кніг і старажытных рукапісаў па гісторыі Беларусі, Літвы, Польшчы. Паводле меркавання В. Цыбуля, у бібліятэцы было шмат тэкстаў з прамовамі дзяржаўных дзеячаў, геральдычных зборнікаў, разнастайных крыніц, якія ўтрымлівалі ўнікальныя звесткі пра польскіх каралёў, літоўскіх і польскіх князёў, прац па магдэбургскім праве, аб руска-польскіх адносінах [8]. Тут захоўвалася перапіска Б. Хмяльніцкага з польскімі гетманамі, арыгінал яго маніфеста, дзённік М. Мнішак, дзённік польскага пасольства ў Расіі і шмат іншых каштоўных матэрыялаў, уключаючы рэдкія беларускія выданні. Для бібліятэкі ў канцы XVIII ст. быў узведзены спецыяльны двухпавярховы будынак у стылі класіцызму. Бібліятэка Храптовічаў была сапраўднай Меккай для многіх гісторыкаў краін Еўропы. Так, у свой час Шчорсы з навуковай мэтай наведалі М. Вольскі (гісторык, літаратар), І. Лялявель (гісторык), А. Міцкевіч (паэт), М. Пачобут-Адляніцкі (матэматык, астраном), У. Сыракомля (паэт), Я. Чачот (паэт) і інш. Менавіта тут, у маляўнічых алеях парку, зарадзіліся сюжэты паэм «Гражына», «Конрад Валенрод», многіх вершаў Адама Міцкевіча. Аб гэтым сведчаць, у прыватнасці, такія яго радкі: «А як з-за Шчорсаў выплыве світанне / І блісне над магілаю Міндоўга, / На Лідскай вуліцы хай войска стане, / Статут вайсковы захаваўшы строга» [4, с. 110].

Гасцей маёнтка ўражваў сваёй надзвычайнай прыгажосцю і маштабам парк пейзажнага тыпу, які раскінуўся на 40 гектарах раўніннага рэльефу. Паводле ўспамінаў старажылаў, у ім раслі дрэвы каля 200 найменняў. Складаўся парк з некалькіх кампазіцыйна звязаных частак. Перад парадным фасадам палаца была разбіта невялікая пляцоўка з дэкаратыўнымі кустамі і кветкамі. Далей, на захад і паўднёвы захад ад палаца, пачынаўся суцэльны паркавы масіў з вадаёмамі і кальцавой дарожкай. З тыльнага боку палаца знаходзілася адкрытая пляцоўка з асобнымі групамі дрэў, ланцугом вадаёмаў, якія мелі натуральныя абрысы. Пасярод сажалак месціліся астравы з альтанкамі і арачнымі мастамі. Гэтыя астравы стваралі ілюзію аддаленасці берагоў, надаючы пэўную глыбіню перспектыве. Астравы

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

былі аформлены чорнай алешынай, ломкай івай, ясенем, таполяй, экзатычнымі раслінамі.

Сістэма вадаёмаў падзяляла паркавы масіў на дзве часткі. Паўночна-ўсходняя была засаджана дрэвамі, традыцыйнымі для Беларусі, і перасякалася невялікім ручаём, які ўпадаў у Нёман. Праз яго пралягалі дзве гравійныя дарожкі, уздоўж іх стаялі лаўкі. Паўднёва-ўсходнюю частку ўпрыгожваў велізарны трохствольны «дуб Міцкевіча». (Цяпер дрэва засохла. Застаўся толькі ствол, у шчыліне якога расце маладзенькі ясень.)



Як мы ўжо адзначалі, ваенны смерч пракаціўся і па гэтым дзівосным ансамблі. Да кастрычніка 1915 г. лінія агню праходзіла па восі Міхалішкі – Ашмяны – Навагрудак – Баранавічы – возера Выганаўскае. Большая частка Навагрудчыны была акупавана нямецкімі і аўстра-венгерскімі войскамі. Жорсткія баі адбываліся тут і летам 1916 г. падчас Баранавіцкай, ці Скробава-Гарадзішчанскай наступальнай аперацыі. Галоўны ўдар па германскай арміі наносіўся непадалёк ад Шчорсаў, у раёне Гарадзішча – Баранавічы. Снарады цяжкай артылерыі знішчалі ўсё, што трапляла ў зону артабстрэлу і бомбавых udараў. У ходзе баявых дзеянняў расійскай і германскай армій, якія вяліся ў раёне Навагрудка, палац Храптовічаў цалкам згарэў, а парку былі нанесены значныя пашкоджанні. У пажары быў знішчаны амаль увесь бясцэнны фонд бібліятэкі. Толькі 4500 тамоў паспеў перадаць на часовае захаванне Кіеўскаму ўніверсітэту тагачасны ўладальнік сядзібы К. А. Буцянёў, унук сястры Іахіма Храптовіча. Аднак, на жаль, гэты скарб беларускага народа да гэтага часу на радзіму не вернуты.

З разбурэннем палаца рэшткі некалі велічнага ансамбля паступова пачалі прыходзіць у заняпад. Ацалелыя фрагменты ўнікальнага комплексу – двухпавярховы будынак бібліятэкі, дом прыслугі, капцільня, руіны гаспадарчага двара і стайняў, падмурак агароджы – паступова разбураліся. У мінулым стагоддзі пабудовы, якія захаваліся, былі перададзены мясцоваму калгасу. Сёння іх займае мясцовая адміністрацыя і дзіцячы садок. Раней у будынку бібліятэкі месцілася школа, потым там знаходзіліся мастацкія майстэрні. Цяпер будынак пустуе і працягвае разбурацца. Англійскі пейзажны парк набыў рысы здзічэлага лесапаркавага масіву. Каскадная сістэма сажалак выглядае як звычайнае балота. Цяпер Шчорсы ўключаны ў турыстычны маршрут Нясвіж – Навагрудак, але часцей за ўсё аўтобусы нават не спыняюцца каля былой рэзідэнцыі канцлера ВКЛ. Экскурсаводы толькі распавядаюць турыстам пра былую славу Шчорсаў і прапаноўваюць праз вокны аўтобуса падзівіцца на руіны некалі славутага на ўвесь свет палаца-паркавага комплексу.

Безумоўна, былая рэзідэнцыя магнатаў Храптовічаў з'яўляецца ўнікальным культурна-гістарычным помнікам еўрапейскага палаца-паркавага дойлідства і заслугоўвае ўвагі з боку дзяржаўных і грамадскіх структур, як і дзясяткі іншых помнікаў культурнай спадчыны Беларусі. У 2007 г. на кафедры «Горадабудаўніцтва» архітэктурнага факультэта БНТУ пад кіраўніцтвам доктара архітэктуры А. С. Сардарава і дацэнта А. Я. Ніціеўскай студэнты выканалі дыпломны праект на тэму «Перспектыўнае развіццё в. Шчорсы з аднаўленнем гістарычнага парку». У праекце ўтрымліваюцца цікавыя прапановы па генеральным развіцці вёскі з улікам рэстаўрацыі палаца-паркавага ансамбля.

### «Калыска кахання» Адама Міцкевіча

У сацыяльна-палітычным і культурным жыцці беларусаў значную ролю адыгрывалі не толькі ўладальнікі велічных палацаў, але і гаспадары значна меншых па памеры сядзібна-паркавых комплексаў. Ад апісаных вышэй палаца-паркавых ансамбляў яны адрозніваліся не толькі памерамі, але і больш сціплай колькасцю парадных памяшканняў, больш простым дэкорам фасадаў і інтэр'ераў. Такія маёнткі існавалі пераважна ў сельскай мясцовасці, радзей – у гарадах і мястэчках. У XVIII ст. сядзібныя дамы ўзводзіліся, як правіла, у стылі барока, у іх пераважала анфіладная сістэма з лесвіцай і парадным памяшканнямі ў цэнтры. У аздабленні галоўнага фасада выкарыстоўваліся картушы і іншыя

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

дэкаратыўныя элементы. Завяршаліся дамы складанымі дахамі (ламанымі, мансарднымі, яруснымі). Іх на тэрыторыі сучаснай Беларусі налічвалася некалькі соцень.

Да помнікаў сядзібна-паркавай архітэктуры адносіцца, у прыватнасці, сядзіба Туганавічы, якая месцілася ў вёсцы Карчова Баранавіцкага раёна [1, с. 469]. Па сваіх архітэктурных вартасцях яна асабліва не вылучалася сярод іншых сядзіб падобнага тыпу. Але з гэтым прыгожым куткам Беларусі звязаны важныя перыяды жыцця славутых паэтаў Адама Міцкевіча і Тамаша Зана, мастака і кампазітара Напалеона Орды. Тут жыла прыгажуня Марыля Верашчака, якая выклікала глыбокія пачуцці ў юнага Міцкевіча і натхніла яго на стварэнне незабыўных рамантычных твораў. «Ніколі, нідзе не магу я расстацца з табою! / Ідзеш ты па моры, па сушы ў дарогу за мною, / Сляды твае бачу на схілах, высокіх і слізкіх, / І чую твой голас у шуме каскадаў альпійскіх», – напіша паэт у Сплюгене [3, с. 48]. А ў Лазане прызнаецца: «...І вечна сняцца мне Навагрудак і Туганавічы» [2, с. 56]. Даследчыкі творчасці Адама Міцкевіча аднадушны ў меркаванні, что сядзіба Сапліцова, апісаная ў паэме «Пан Тадэвуш», цалкам адпавядае тапаграфіі вёскі Карчова. «Стаяў драўляны панскі дом і з зяляніны /Свяціўся, як сувой кужэльнае тканіны, / Тынкоўкай белай над дыванамі поля. / Ад непагоды затулены сцяной таполяў, / Ён невялікі быў, але не занядбаны» [5, с. 9].

Гісторыя сядзібы Туганавічы пачынаецца з XVIII ст. Менавіта ў гэты час князь Туган у сваім маёнтку на беразе ракі Сэрвач узводзіць сядзібны дом і закладвае парк. Што ўяўляў сабой гэты сядзібна-паркавы ансамбль, можна меркаваць па акварэлі Н. Орды і апісанні маёнтка ў паэме «Пан Тадэвуш». Невялікі класіцыстычны белы дом з тэрасай на чатырох калонах размяшчаўся ў парадной частцы парку. Побач з домам быў узведзены флігель з мураваным ганкам і аранжарэяй. На ўзгорыстай паўднёва-заходняй частцы маёнтка ўзвышалася пахавальная капліца. З заходняга боку размяшчаліся гаспадарчыя пабудовы.

Гонарам князя Тугана, а потым і паноў Верашчакаў, да якіх перайшла сядзіба, быў пейзажны парк пераходнага тыпу, які раскінуўся на маляўнічай перасечанай мясцовасці за межамі вёскі. Парк займаў квадратную плошчу ў 8 га. Яго кампазіцыя грунтавалася на палянах з курцінамі. У сувязі з гэтым парк меў пяць аглядных пунктаў на прыродных і насыпных узгорках. Галоўным пунктам агляду быў узгорак каля дубоў-блізнят, адкуль адкрывалася перспектыва на цэнтральныя паляны. З узгоркаў усходняй часткі парку адкрываліся перспектывы на пойму ракі і невялікія штучныя вадаёмы. Насыпны ўзгорак у паўночна-ўсходняй частцы парку акружала пратока, якая была звязана з сажалкамі.

Важным кампазіцыйным элементам лічылася ліпавая курціна з альтанкай на асноўнай дарозе праз парк. Ад яе па лузе разбягаліся вузкія сцяжынкі да аглядных узгоркаў. Яны маляўніча віліся сярод дрэў розных парод (42 найменняў), абягалі ўзвышшы, перасякалі паляны і губляліся ў патаемных кутках. Тут, ва ўрочышчы Кут, збіраліся ўдзельнікі тайнага студэнцкага таварыства філаматаў і філарэтаў. Аб гэтым сведчыць велізарны валун, які атрымаў у народзе назву «камень філарэтаў». Каля яго І. Дамейка, Т. Зан, А. Міцкевіч, Ю. Яжоўскі, Ф. Малеўскі, Я. Чачот давалі клятву вернасці ідэалам філарэтаў.



У адной з альтанак парку звычайна сустракаліся закаханыя Адам Міцкевіч і Марыля Верашчака. «Калыскай кахання» назваў паэт гэтую альтанку пад шасцю ліпамі. Яны прастаялі вось ужо больш як 200 гадоў і захаваліся да нашага часу. Непадалёк ад гэтага месца некалі расла і бяроза, пасаджаная Міцкевічам на ўспамін аб незабыўных днях узаемнага кахання. Пра яе паэт пісаў у вершы «Да М***»: «Там, дзе страчаліся шчаснай парою, / Дзе расставаліся сумнай хвілінай, / Буду заўжды неразлучны з табою, / Бо ўсюды частку душы я пакінуў» [3, с. 20]. Бяроза гэтая да сённяшняга дня не дажыла, як не наканавана было і закаханым пранесці сваё шчасце праз усё жыццё. Марылю супраць яе волі выдалі замуж за графа Путкамера, якога яна не кахала. Адам вымушаны быў жыць удалечыні і ад каханай жанчыны, і ад любімай радзімы.





РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ



З сядзібай Туганавічы звязаны і падзеі нацыянальна-вызваленчага руху 1863–1864 гг. Тут была створана майстэрня па вырабе зброі для атрада паўстанцаў, які фарміраваўся ў вёсцы Мілавіды. На патрэбы паўстанцаў М. Верашчака ахвяравала значную частку ўласных сродкаў.

Першая сусветная вайна смяротным агнём апаліла гэты дзівосны некалі куточак нашай краіны. Баранавіцкі раён апынуўся ў цэнтры ваенных дзеянняў. З самага пачатку баёў тут канцэнтраваліся буйныя як расійскія, так і нямецкія ваенныя сілы. У 1914–1915 гг. у Баранавічах знаходзілася Стаўка Мікалая II, а пасля акупацыі горада восенню 1916 г. войскамі праціўніка – галоўны штаб германскага ўсходняга фронту. Летам 1916 г. тут адбыліся жорсткія баі, у наступным яны атрымалі назву «Баранавіцкая аперацыя». Амаль месяц 4-я расійская армія ў кровапралітнай бітве імкнулася прарваць глыбока эшаланіраваную абарону немцаў. Па падліках спецыялістаў, тут загінула каля 100 тыс. расійскіх салдат. І ўсё ж расійская армія вымушана была адступіць. Горад быў акупаваны германскімі і аўстра-венгерскімі войскамі. У выніку ваенных дзеянняў быў непапраўна пашкоджаны Туганавіцкі сядзібна-паркавы комплекс, поўнасцю зруйнавана капліца. Да гэтага часу на асобных узгорках парку, па якіх праходзіла лінія фронту, можна заўважыць сляды былых траншэй і акопаў, што параслі здзічэлымі дрэвамі і кустамі. Толькі пільна прыгледзеўшыся, можна заўважыць контурныя лініі былой тэрыторыі парку. Захаваліся асобныя групы дрэў, утвораныя невялікімі масівамі граба, дуба, клёна, ліпы. Сажалкі, якія паэтызаваў А. Міцкевіч, абмялелі, амаль зараслі і пакрыліся зялёнай цінай. У 1930 г. былі праведзены пэўныя работы па добраўпарадкаванні парку, але пасля Другой сусветнай вайны спроб адрадзіць сядзібу і парк не рабілася.

Такіх страчаных палаца-паркавых ансамбляў і сядзібна-паркавых комплексаў на Беларусі вельмі шмат. Большасць з іх стала ахвярамі апусташальных войнаў і духоўнага ўбоства людзей. Дзякуй Богу, у апошнія гады сітуацыя пачала змяняцца. Пастукова вяртаюцца з нябыту культурна-гістарычныя помнікі. Адрэстаўраваны Нясвіжскі палаца-паркавы ансамбль, Мірскі і Лідскі замкі. Працэс гэты надзвычай складаны і не хуткі, але галоўнае, што беларусы прыйшлі да разумення неабходнасці зберажэння сваёй культурнай спадчыны, выхавання на яе традыцыях маладога пакалення. Спадзяёмся, што і ўзгаданыя намі сёння помнікі палаца-паркавага мастацтва ў недалёкай будучыні паўстануць з попелу.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА


1. **Архітэктура Беларусі**: энцыкл. давед. / рэдкал.: А. А. Воінаў і інш. – Мінск: БелЭн, 1993. – 620 с.: іл.
2. **Дерналович, М.** Адам Мицкевич / М. Дерналович. – Варшава, 1969. – 111 с.
3. **Міцкевіч, А.** Выбраныя творы / А. Міцкевіч. – Мінск: Маст. літ., 1955. – 271 с.
4. **Міцкевіч, А.** Гражына. Літоўская аповесць / А. Міцкевіч // Вершы і паэмы / уклад. А. Клышка і К. Цвірка; прадм. А. Лойкі. – Мінск: Маст. літ., 2000. – С. 107–136.
5. **Міцкевіч, А.** Пан Тадэвуш, або Апошні наезд у Літве: Шляхецкая гісторыя 1811–1812 гадоў: у 12 кн. / А. Міцкевіч; пер. з польск. мовы і камент. Я. Семяжона; прадм. К. Цвіркі. – Мінск: Маст. літ., 2010. – 438 с.
6. **Сідарэвіч, А.** Першая сусветная вайна (1914–1918) / А. Сідарэвіч // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 5 / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (галоўны рэд.) і інш.; маст. Э. Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 1999. – С. 472–476.
7. **Федорук, А. Т.** Садово-парковое искусство Белоруссии / А. Т. Федорук. – Минск: Ураджай, 1989. – 247 с.
8. **Цыбуля, В. А.** Прыватныя бібліятэкі, архівы і музеі / В. А. Цыбуля // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1982. – № 3. – С. 33–38.
9. **Швейцер, А.** Упадок и возрождение культуры / А. Швейцер. – М.: Прометей, 1993. – 512 с.
10. **Tyszkiewicz, Hr. Konstanty.** Wilija i jej brzegi / Hr. Konstanty Tyszkiewicz. – Vilnius, 2008. – 362 s.